Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

26 СТУДЗЕНЯ 2008 г. СУБОТА

№ 16 (26129)

Кошт 430 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Паказчыкі работы лёгкай прамысловасці ў 2008 годзе павінны быць вышэйшыя, чым іншых галін

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час наведвання ў Жодзіне выстаўкі тавараў, якія выпускаюцца арганізацыямі канцэрна «Беллегпрам».

«Пакуль што вы не можаце прапанаваць людзям нармальны тавар, каб яны не куплялі нізкаякасны імпарт, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да прадстаўнікоў прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці. — Мы гаворым пра тэкстыль столькі, колькі я Прэзідэнт. Галіна знаходзіцца ў глыбокай яме».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на неабходнасць найхутчэйшага тэхналагічнага перааснашчэння галіны, нарошчвання экспартных паставак тавараў лёгкай прамысловасці Беларусі, у тым ліку ў краіны ЕС, а таксама павышэння прадукцыйнасці працы. Акрамя таго, Прэзідэнт асабліва адзначыў нізкі ўзровень менеджменту ў гэтай галіне.

«Я цвёрда перакананы: дырэктары — лайдакі. Калі не можаце справіцца — ідзіце, — заявіў Прэзідэнт. — Я ўзяў на кантроль некалькі прадпрыемстваў. Там, дзе мы паднаціснулі, справы ідуць так, як трэба».

У якасці станоўчага прыкладу кіравання прадпрыемствам кіраўнік дзяржавы назваў кіраўніцтва СТАА «Марка».

Лёгкая прамысловасць Беларусі павінна выпускаць тое, што сёння запатрабавана на рынку, і тое, што будзе запатрабавана заўтра. Звяртаючыся да кіраўнікоў прадпрыемстваў легпрама, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Я хачу, каб вы далі права выбару нашаму народу, апранулі людзей так, як апранаюць ва ўсім свеце. Я хачу, каб дарослыя і дзеці насілі добры абутак, каб не куплялі яго за мяжой».

Прэзідэнт наведаў у Жодзіне выстаўку тавараў, якія выпускаюцца арганізацыямі канцэрна «Беллегпрам». Паводле яго слоў, тут прадстаўлены нядрэнныя рэчы, якія ёсць у масавай вытворчасці і продажы. «Калі б такога ўзроўню была ўся прадукцыя, тады можна было б патрабаваць не захавання галіны, а яе дынамічнага развіцця», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Аднак сёння, на яго думку, добра працуюць толькі 50 працэнтаў прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці.

Асаблівую ўвагу Аляксандр Лукашэнка ўдзяліў неабходнасці забяспечыць дастойныя ўмовы працы і заработную плату на прадпрыемствах легпрама. Сёння 80 працэнтаў працуючых тут складаюць жанчыны. Акрамя таго, на нарадзе разгледжаны пытанні абнаўлення асноўных вытворчых фондаў. «Існуе вялікая зношанасць фондаў, іх трэба мяняць, мадэрнізаваць. Але пакуль трэба выпускаць прадукцыю на такім абсталяванні. А для мадэрнізацыі неабходна зарабіць грошы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт таксама адзначыў, што неабходна вырашаць праблему скарачэння запасаў гатовай прадукцыі і павышаць рэнтабельнасць вытворчасці.

БЕЛТА.

У СТВАРЭННІ МЫТНАГА САЮЗА АДБЫЎСЯ ІСТОТНЫ ПРАРЫЎ

Беларусь, Расія і Казахстан падпісалі пакет пагадненняў аб фарміраванні Мытнага саюза. Учора ў Маскве прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі, прэм'ер-міністр Расіі Віктар Зубкоў і прэм'ер-міністр Казахстана Карым Масімаў падпісалі 9 дакументаў.

У стварэнні Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана адбыўся істотны прарыў. Аб гэтым заявіў беларускі прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі, каментуючы вынікі пасяджэння Міждзяржсавета ЕўрАзЭС на ўзроўні кіраўнікоў урадаў.

Сяргей Сідорскі растлумачыў, што ўсяго для завяршэння фарміравання Мытнага саюза неабходна падпісаць 30 пагадненняў. Чатыры з іх былі раней падпісаны прэзідэнтамі трох краін, яшчэ дзевяць — учора прэм'ер-міністрамі Беларусі, Расіі і Казахстана. Астатнія дакументы, паводле слоў беларускага прэм'ера, будуць падпісаны на працягу бліжэйшых двух гадоў.

Ён таксама падкрэсліў, што наступным важным крокам на шляху фарміравання Мытнага саюза стане стварэнне Камісіі Мытнага саюза — наднацыянальнага органа, якому паступова будуць перададзены паўнамоцтвы па рэгуляванні знешнегандлёвай дзейнасці краін-удзельніц.

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі выказаўся за неабходнасць прыняцця далейшых мераў па фарміраванні Саюзнай дзяржавы. Аб гэтым ён заявіў у Маскве ў час сустрэчы з прэм'ер-міністрам Расіі Віктарам Зубковым.

Сяргей Сідорскі адзначыў, што далейшаму збліжэнню Беларусі і Расіі будуць садзейнічаць рашэнні, прынятыя кіраўніком беларускай дзяржавы Аляксандрам Лукашэнкам у канцы мінулага года, у прыватнасці, яны далі магчымасць на 95 працэнтаў уніфікаваць мытныя тарыфы, дзеючыя ў Беларусі і Расіі.

БЕЛТА.

Вядомы на Брэстчыне фальклорны калектыў «Лабчанка» з вёскі Лобча Лунінецкага раёна — як адна сям'я — музычны, спеўны. Яны часта збіраюцца разам не толькі на канцэртных пляцоўках. Душа гэтай сям'і, лепшы народны голас Лунінеччыны — Настасся Якавец.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ГРЫП У «НАСТУПЕ»

Паводле інфармацыі рэспубліканскай санэпідслужбы, на 25 студзеня да ўжо «грыпуючых» тэрыторый далучыліся таксама Брэст, Барысаў, Свіслацкі, Ашмянскі, Беравтавіцкі, Мастоўскі, Шчучынскі і Барысаўскі раёны. За адзін дзень, 24 студзеня, у кантрольных гарадах па медыцынскую дапамогу звярнуліся 13 195 чалавек, з якіх больш за палову складаюць дзеці ва ўзросце да 15 гадоў. У сувязі з адсутнасцю больш як 30 працэнтаў навучэнцаў, навучальны працэс спыніўся ў 6 установах адукацыі (у Слуцкім, Любанскім, Старадарожскім, Дзятлаўскім раёнах, у Лідзе і ў Фрунзенскім раёне г. Мінска), а таксама ў двух дзіцячых садках у Старых Дарогах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЗІМА. ЧАС САДЗІЦЬ ДРЭВЫ

Гамяльчане здзівіліся, калі ўбачылі, як на вуліцах горада пачалася пасадка дрэў вышынёй да пяці метраў — дваццацігадовых туй. Спецыялісты сцвярджаюць, што дрэвы выдатна прыжываюцца.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Вынікі інфармацыйнага года

Учора ў Мінску прайшла калегія Міністэрства інфармацыі, на якой былі падведзены вынікі працы галіны летась і разглядаліся планы на 2008 год.

Паводле слоў міністра інфармацыі Уладзіміра Русакевіча, летась галіна выканала 9 з 10 прагнозных паказчыкаў. Гаворачы пра паліграфічную галіну, міністр адзначыў, што летась рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі павялічылася і склала амаль 15 працэнтаў.

Што датычыцца праблем паліграфіі, то «шлях нумар адзін» для паліграфкамбіната імя Я. Коласа — гэта рэалізацыя часткі дзяржаўных акцый выдавецтву «АСТ» (Масква). Гэтае расійскае выдавецтва гатове на працягу бліжэйшых 10 гадоў укласці ў развіццё паліграфкамбіната каля 14 млн еўра.

Летась самая сур'ёзная ўвага міністэрства надавалася «ўмацаванню фінансава-эканамічнага стану газет і часопісаў», а таксама павышэнню ўзроўню іх акупнасці. Паводле папярэдняй інфармацыі, рэдакцыі атрымалі прыбытку на суму 14,8 млрд рублёў. Гэта на 32 працэнты больш, чым у 2006 годзе. У той жа час затраты на выданне былі большыя — 19 млрд. Колькасць рэдакцый мясцовага друку, якія па выніках года спрацавалі з прыбыткам, узрасла — іх было 24.

Гаворачы пра электронныя СМІ, міністр адзначыў, што асноўнай задачай айчынных рэспубліканскіх тэлеканалаў сёння з'яўляецца павелічэнне ўласнага прадукту.

Летась, паводле слоў Уладзіміра Русакевіча, вялася праца па пашырэнні сеткі кабельных аператараў і асноўнага пакета праграм. Сёння аператарамі транслююецца каля 100 замежных тэлеканалаў, прыкладна палова з якіх — расійскія.

На працягу апошніх трох гадоў Міністэрства інфармацыі праводзіла штотыднёвы маніторынг FM-эфіру ў краіне на наяўнасць 70 працэнтаў беларускага прадукту. Сёння ж, на думку міністра, «выхаваўчы працэс ужо скончаны» і «замеры можна памяншаць».

Аўдыторыя спадарожнікавага тэлеканала «БеларусьТБ» сёння налічвае каля 7 млн чалавек. На думку міністра, гэта «вялікі поспех», улічваючы, што каналу толькі 3 гады.

У той жа час, паводле слоў Уладзіміра Русакевіча, існуюць праблемы з распаўсюджваннем канала ў Расіі. «Асабліва ў Маскве, у кабельных сетках». Каб вырашыць гэтую праблему, Беларусь мае намер падпісаць міжурадавае пагадненне аб дзейнасці СМІ (уключаючы тэлеканалы) у Саюзнай дзяржаве.

Сёння ў Беларусі зарэгістравана 1266 друкаваных СМІ, 156 — радыё- і тэлепраграм. Пачынаючы з 1996 года было анулявана 1214 пасведчанняў аб рэгістрацыі. На думку міністра, «гэта натуральны працэс рэгістрацыі, пазбаўлення ліцэнзіі і спынення існавання».

Сёлета міністэрства вынесла 86 пісьмовых папярэджанняў 76 выданням за парушэнні заканадаўства. Дзейнасць трох выданняў прыпынялася тэрмінам на тры месяцы. «Я лічу, што створаны ўсе неабходныя ўмовы для існавання і працы СМІ ў Беларусі. А калі нехта парушае закон, то ён нясе за гэта адказнасць. Вось і ўсе каментарыі».

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

Да Br2200 за долар

Мяркуецца, што ў гэтым годзе курс амерыканскай валюты істотна не зменіцца і будзе знаходзіцца ў дыяпазоне 2100—2200 рублёў за долар.

Забеспячэнне ўстойлівасці нацыянальнай валюты, у тым ліку яе пакупной здольнасці і курса ў адносінах да замежных валют, стала адным з пытанняў, якое разглядалася ўчора на пашыраным праўленні Нацыянальнага банка. Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч, такім чынам зменіцца сёлета курс нашага рубля ў межах плюс-мінус 2,5 працэнта.

Як адзначалася на пасяджэнні, летась насельніцтва актыўна крэдытавалася банкамі. Так, напрыклад, у 2007 годзе ў параўнанні з папярэднім на будаўніцтва жылля выдадзена больш ільготных крэдытаў у 1,3 раза, запазычанасць фізічных асобаў па крэдытах на фінансаванне жылля, выдадзеных на агульных падставах, узрасла ў 1,46 раза, а па крэдытах на спажывецкія мэты — амаль у 1,5 раза.

Ігар ГРЫШЫН.

За крок да перамогі

Учора ў паўфінале Кубка чэмпіёнаў Садружнасці БАТЭ ўступіў азербайджанскаму "Хазару" — 1:2. Гол у складзе беларусаў забіў Віталь Радзівонаў (ён зраўняў лік на 72-й хвіліне).

Ірына АНАТАВА.

«Прафтэхшколе трэба вяртаць аўтарытэт»

«Апошнім часам прыярытэты ў сферы адукацыі змясціліся ў нашай краіне ў бок вышэйшай школы. Агульнаадукацыйная школа ледзьве не з першага класа нацэльвае сваіх вучняў на паступленне ў ВНУ. А сістэма прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі пераўтварылася ў нейкую прамежкавую прыступку ў неперарыўнай адукацыі», — такую думку выказала на калегіі Міністэрства адукацыі, дзе падводзіліся вынікі дзейнасці галоўнага адукацыйнага ведамства за 2007 год, начальнік упраўлення сацыяльна-культурнай палітыкі Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ірына Дрыга. На думку Ірыны Дрыгі, сістэме прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі трэба вяртаць ранейшы аўтарытэт, таму што ў Беларусі сёння востра не хапае рабочых кадраў і спецыялістаў сярэдняга звяна: «Прафесійна-тэхнічную і сярэднюю спецыяльную адукацыю маладыя людзі разглядаюць як не зусім паўнавартасную — такое стаnovішча трэба змяняць. Увогуле ўсім нам трэба задумацца, а ці патрэбная нам масавая вышэйшая адукацыя? Магчыма, ВНУ праследуюць меркантыльныя мэты, пераўтвараючы вышэйшую адукацыю ў адукацыю для агульнага развіцця без уліку запатрабаванасці выпускаемых спецыялістаў і рэальных патрэбаў рынку працы? Абсалютна відавочна, што будучыня — за інжынернымі кадрамі».

Паводле даных сацыялагічнага даследавання, галоўнымі фактарамі, якія ўплываюць на зніжэнне цікаўнасці дзяцей да навучання ў школе, паводле меркавання бацькоў, вучняў і педагогаў, з'яўляюцца празмерна складаныя вучэбныя праграмы і падручнікі. «У сувязі з гэтым у нас узнікае заканамернае пытанне: «А ці ўсё мы зрабілі для змяншэння вучэбных нагрузак на нашых дзяцей?» Нас запэўніваюць у тым, што на 30 працэнтаў былі палегчаны вучэбныя праграмы, але ці так гэта? Упэўненасці няма, — падзялілася сваімі сумненнямі Ірына Дрыга. — Увогуле, на маю думку, дзеці павінны самастойна асвойваць вучэбную праграму без прыцягнення бацькоў і дапамогі рэпетытараў...».

Паколькі ў наступным навучальным годзе старшая ступень 12-гадовай школы плануе пераходзіць на профільнае навучанне, Ірына Дрыга засяродзіла ўвагу членаў калегіі на наступных праблемах: «Ці будзе школа пры ўкараненні профільнага навучання заўсёды ўлічваць інтарэсы дзяцей або гэта будзе навучанне па разнарадцы? Ці зможам мы заўсёды забяспечыць дастаткова высокі кадравы ўзровень і належны ўзровень матэрыяльна-тэхнічнай базы? Магчыма, варта падумаць над тым, каб школа арыентавалася, як і раней, на ўсіх вучняў, якія маюць розныя здольнасці і розныя жыццёвыя планы, а навучанне асабліва адораных дзяцей варта ажыццяўляць у гімназіях і ліцэях?»

Надзея НІКАЛАЕВА.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион по продаже в Пуховичском районе обращенного в доход государства имущества:

- здание конторы общей пл. 258,5 кв.м, д. Пуховичи, ул. Садовая, д. 22. Начальная цена – 55 924 899 бел. рублей;

- здание свинарника № 1 общей пл. 556,5 кв.м, д. Габриелевка. Начальная цена – 67 927 899 бел. рублей.

Начальные цены снижены на 20 %. Подробные извещения опубликованы в газетах «Звязда» от 21.04.2007 г. и 08.08.2007 г. Аукцион состоится 14.02.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 13.02.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Слуцком райисполкоме, проводит открытый аукцион

по продаже обращенного в доход государства: производственного корпуса (об. пл. 279,7 кв.м), расположенного по адресу: г. Слуцк, ул. Богдановича, 10. Начальная цена — 120 000 000 белорусских рублей. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект осуществляется в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. Объект продается без условий. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 04.03.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 03.03.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34,
Сайт в Интернете: www.rlt.by

УНП 690324015

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

РАСІЯ ВЫСЫЛАЕ ЛАТВІЙСКАГА ДЫПЛАМАТА

Супрацоўнік пасольства Латвіі ў Маскве абвешчаны персонай нон грата, у двухдзённы тэрмін яму прадпісана пакінуць тэрыторыю Расійскай Федэрацыі.

МЗС Расіі сцвярджае, што дзейнасць пасла была несумяшчальная са статусам дыпламата і нанесла ўрон інтарэсам бяспекі РФ. Імя і пасаду дыпламата МЗС не называе.

ДЭВІД БЭКХЕМ — ПАГРОЗА НАВАКОЛЬНАМУ АСЯРОДДЗЮ

Брытанскі футбаліст Дэвід Бэкхем і яго сям'я аказваюць крайне негатыўны ўплыў на навакольнае асяроддзе. Да такой высновы прыйшла экалагічная арганізацыя Carbon Trust.

Згодна са складзеным экалагамі рэйтынгам, які ацэньвае шкоду, што наносіць навакольнаму асяроддзю канкрэтная асоба, на долю Бэкхема ў год прыпадае 163 тоны вуглякіслага газу, які выкідваецца ў атмасферу. У радавога жыхара Вялікабрытаніі гэты паказчык не перавышае 9,4 тоны на год. Такі значны негатыўны ўплыў футбаліста на навакольнае асяроддзе экалагі тлумачаць стылем жыцця зоркі. Бэкхем у 2007 годзе праляцеў больш за 400 тысяч кіламетраў на самалётах паміж Брытаніяй і ЗША, дзе ён гуляе за адзін з футбольных клубаў. Яшчэ 80 тысяч кіламетраў летась футбаліст і яго жонка праляцелі дзеля таго, каб узяць удзел у рэкламных кампаніях і свецкіх мерапрыемствах. Самалёты, як адзначаюць складальнікі рэйтынгу, выкідваюць у атмасферу значную колькасць вуглякіслага газу. Негатыўны ўплыў на навакольнае асяроддзе Бэкхемы ўзмацняюць сваім аўтапаркам — яны валодаюць 15 аўтамабілямі з магутнымі рухавікамі. Акрамя таго, сям'і належаць некалькі велізарных асабнякоў, якія спажываюць многа электраэнергіі, вады і іншых рэсурсаў.

НЯВЕСТА ПРЭЗІДЭНТА ФРАНЦЫІ СФАТАГРАФАВАЛАСЯ ГОЛАЙ

Былая мадэль, спявачка і нявеста прэзідэнта Францыі Нікаля Сарказі Карла Бруні знялася голай для іспанскага мужчынскага часопіса «DT».



Цікава, што на фатаздымку на безыменным пальцы Бруні бачны заручальны пярсцёнак, які многія СМІ прынялі за сведчанне аб замоўцы ці шлюбе мадэлі з прэзідэнтам. Прадстаўнікі «DT», аднак, сцвярджаюць, што фатаздымкі былі зроблены задоўга да рамана Сарказі і Бруні.

ДЛЯ КАСМІЧНЫХ ТУРЫСТАЎ

У Нью-Йорку кампанія Virgin Galactic прадставіла карабель для субарбітальных палётаў.

Судна SpaseShipTwo зможа дастаўляць да 8 чалавек (2 пілоты і 6 пасажыраў) за рэйс на вышыню ў 110 кіламетраў. Палёт будзе працягвацца 2 гадзіны, да камерцыйных палётаў пяройдуць праз 12 месяцаў пасля завяршэння выпрабаванняў. Кошт білета складзе 200 тысяч долараў. Праект гатовы на 60 працэнтаў і будзе завершаны да 2010 года. Запуск апарата будзе здзяйсняцца з самалёта.

Дайце вучоным прававую базу!

Навукі на прадпрыемстве не бачна, аднак яе адсутнасць там вельмі заўважная.

З гэтага тэзіса пачаў сваю размову з журналістамі напярэдадні Дня беларускай навукі першы намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Пётр Віцязь.

«У нас няма прававой асновы для інавацыйнага развіцця краіны, — паведаміў Пётр Віцязь. — Ёсць асобныя дакументы, аднак няма цэласнай сістэмы, у тым ліку наконт абароны інтэлектуальнай уласнасці. Мы сёння ўмеем лічыць, колькі каштуе жалеза, аднак колькі каштуе ноўхаў і тэхналогія — не. Адпаведныя методыкі існуюць, але не ўзаконены сам прынцып, а гэта значна тармозіць інавацыйны шлях. Мы не можам перадаць распрацоўку тым, хто сёння мае жаданне ўкласці ў яе грошы, прыйсці на наш рынак, арганізаваць тут вытворчасць. Для гэтага няма адпаведнай прававой асновы».

З ім пагадзіўся намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь Ігар Войтаў. Ён паведаміў, што ў мінулым годзе Міністэрствам адукацыі і аблвыканкамамі былі прыняты рашэнні па стварэнні і развіцці шэрагу навукова-тэхналагічных паркаў у рэгіёнах, аднак ажыццяўленне гэтыя задумы не атрымалі па прычыне іх нестыкоўкі з палажэннямі Грамадзянскага кодэкса. Ён не прадугледжвае для дзяржаўных устаноў, якімі з'яўляюцца ВНУ, права стварэння навукова-тэхналагічных паркаў і іншых інавацыйных прадпрыемстваў, чыя дзейнасць скіравана на атрыманне прыбытку. Гэтая праблема абмяркоўвалася і на Першым з'ездзе вучоных. «Нам патрэбны нарматыўны дакумент, які прадаставіў бы ВНУ права актыўна ўдзельнічаць у фарміраванні інавацыйнай інфраструктуры», — падкрэсліў Ігар Войтаў.

Інга МІНДАЛЁВА.

27 студзеня — Міжнародны дзень памяці ахвяраў Халакоста

ПАМЯЦЬ ЯК УРОК

У нядзелю па ўсім свеце пройдуць мерапрыемствы, прысвечаныя Дню памяці ахвяраў Халакоста. У Мінску заўтра з гэтай нагоды ў Рэспубліканскім Палацы культуры ветэранаў (вул. Я. Купалы, 21) а 13-й гадзіне збяруцца прадстаўнікі міжнародных і грамадскіх арганізацый, былыя вязні і воіны-вызваліцелі Асвенціма, усе, каго хвалюе тэма Халакоста, каб яшчэ раз успомніць тое, што ніколі не павінна паўтарыцца.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мая КРАПІНА (ЛЕВІНА) — малалетняя вязніца Мінскага гета. Яе маці была закатавана падчас першага пагрому ў гета.

Міжнародны дзень памяці ахвяраў Халакоста аб'яўлены Генеральнай Асамблеяй ААН у 2005 годзе. Дата абрана ў памяць аб вызваленні 27 студзеня 1945 года Савецкай арміяй самага буйнога нацысцкага лагера смерці Асвенцім-Біркенау (Польшча). За гады вайны ў падобных лагерах было знішчана 60 працэнтаў яўрэяў Еўропы і прыкладна 35 працэнтаў яўрэйскага насельніцтва ўсяго свету.

Трагедыю Халакоста перажыла і Беларусь. З 1941 па 1944 год тут былі закатаваны каля 800 тысяч яўрэяў. У Мінскім гета, адным з самых буйных у Еўропе, знаходзілася больш за 100 тысяч вязняў.

— У Беларусі былі арганізаваны больш за 250 гета, — расказала карэспандэнту «Звязды» Іна ГЕРАСІМАВА, старшыня Грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі фонд «Халакост». — Мы зараз складаем карту яўрэйскіх гета, работа вельмі вялікая, яна доўжыцца ўжо два гады і яшчэ не завершана. Даводзіцца шмат удакладняць, выязджаць на месцы, шукаць сведкаў, рабіць запыты ў архівы. Тут нам каласальную дапамогу аказвае Нацыянальны архіў Беларусі. Увогуле, мы складаем чатыры карты: яўрэйскія гета, месцы масавага знішчэння, падпольныя арганізацыі ў гета і зоны дзейнасці партызанскіх атрадаў, у якіх была значнай доля яўрэяў. Усё гэта разам адлюстроўвае найбольш поўна гісторыю яўрэйскага народа на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Гэтыя карты, якія ўвесь час удакладняюцца, і іншы багаты матэрыял на тэму Халакоста знаходзяцца ў Музеі гісторыі яўрэяў на Беларусі (Мінск, вул. В. Харужай, 28). Работа сапраўды праводзіцца вялікая, і, нягледзячы на тое, што пасля вайны прайшло больш за 60 гадоў, ёй не бачна канца. Работа гэта патрэбная не толькі дзеля пашаны памяці нявінна забітых. Не толькі дзеля аднаўлення гістарычнай праўды. Самае галоўнае — дзеля таго, каб моладзь ведала, што такое ў чалавечай гісторыі было — людзей забівалі з-за прыналежнасці да іншай нацыянальнасці. І кожны чалавек адказны за тое, каб падобнае не паўтарылася.

Галоўная мэта Міжнароднага дня памяці ахвяраў Халакоста — стымуляванне адукацыйных праграм на гэту тэму, падкрэсліла Іна Герасімава. У Беларусі апошнім часам Міністэрства адукацыі робіць значныя крокі для таго, каб школьнікі і студэнты ведалі пра Халакост больш. У снежні стартаваў падтрыманы адукацыйным ведамствам Другі рэспубліканскі конкурс для ўсіх навучальных устаноў Беларусі «Халакост: гісторыя і сучаснасць. Урокі талерантнасці». Пра ўмовы конкурсу можна даведацца на сайце Мінскага яўрэйскага абшчыннага дома (www.meod.by) у раздзеле «Рэспубліканскі фонд «Халакост».

— Мы праводзім экскурсіі для школьнікаў і семінары для настаўнікаў, якія хочуць дапоўніць інфармацыю, дадзеную ў падручніках па гісторыі, — дадала Іна Герасімава. — Напрыканцы мінулага года прысвячалі семінар у Навагрудку яўрэйскаму супраціўленню. У Навагрудку яно было адным з самых значных. У сакавіку плануем правесці сустрэчу ў Бабруйску, прысвечаную закатаваным дзецям, і прывезці настаўнікаў да нядаўна адкрытага помніка ў Красным Беразе.

Разам з настаўнікамі Рэспубліканскі фонд «Халакост» задумаў стварэнне каталога помнікаў ахвярам Халакоста на тэрыторыі Беларусі. Аказалася, што такой базы даных няма, а ў нас ёсць нямала значных помнікаў, пра якія амаль ніхто не ведае. Для стварэння каталога трэба сфатаграфаваць кожны памятны знак, сабраць пра яго звесткі і знайсці інфармацыю пра падзеі, якім ён прысвечаны. Гэта вялікая работа, ажыццявіць якую можна толькі пры ўдзеле ўсёй грамадскасці.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Па чутках і аўтарытэтна

ДАХОД З РЫЗЫКАЙ...

Надзея хутка пабагацець, мабыць, сыграла злы жарт ні з адным нашым суайчыннікам. Прычым часта даверлівыя людзі ўкладваюць свае грошы ў нейкі праект, таму што шчыра вераць — альтруістаў нашмат болей, чым гэта ёсць насамрэч. І страчваюць пачуццё рэальнасці. Чым гэта заканчваецца — па адказ далёка хадзіць не трэба: чытачы больш сталага ўзросту памятаюць вакханалію вакол тых жа «фінансавых пірамід», калі абяцанні аб казачна высокіх працэнтах літаральна «зносілі» галовы ў грамадзян, а ўрэшце атрымліваўся гучны «пшык». Для многіх ацверазенне наступала толькі тады, калі даводзілася падлічваць панесены ўрон і класці на паліцу зубы.

Расчароўвацца ж, пагадзіцеся, заўсёды цяжка. А для таго каб па максімуму ўратаваць сябе ад такога непрыемнага пачуцця, здаецца, патрэбна няшмат — добра падумаць, перш чым прыняць нейкае канчатковае рашэнне. Між іншым, з апошнім у нас павінна быць усё ў парадку — нездарма ж беларусы лічацца разважлівымі людзьмі.

А цяпер, як кажуць, мы і падышлі да галоўнага: як высвятляецца, сёння ўсё больш нашых жыхароў праяўляе цікавасць да ўкладання сваіх сродкаў у расійскія паявыя інвестыцыйныя фонды (ПІФы). Пацвярджаецца гэта і інфармацыяй, якую мы атрымалі ў Нацыянальным банку Беларусі: менавіта тут фіксуецца найбольшая колькасць зваротаў з пытаннямі людзей аб парадку ажыццяўлення аперацый па пераводзе грашовых сродкаў у ПІФы — гэта грамадзяне, якія легальна спрабуюць укласці свае сродкі з мэтай зарабіць. Праўда, як паказвае практыка, іншыя на свой страх і рызыку едуць у суседнюю краіну з наяўнасцю, каб не марнаваць час на атрыманне дазволу (яго выдае галоўны банк у адпаведнасці з Законам «Аб валютным рэгуляванні і валютным кантролі»), і на месцы інвестуюць грошы ў даходную справу. І часам развітваюцца не з «лішкамі», а вязуць апошнія грошы, якія выкройваюць з сямейнага бюджэту, не ўлічваючы таго факта, што размова ідзе пра доўгатэрміновыя, а галоўнае — рызыкоўныя ўкладанні. Зыходзячы з апошняга, спецыялісты Нацыянальнага банка і вырашылі звярнуць увагу насельніцтва на некаторыя асаблівасці, якія звязаны з такім інвеставаннем. У прыватнасці, разабрацца з сітуацыяй нам дапамог начальнік Галоўнага ўпраўлення валютнага рэгулявання і валютнага кантролю Нацыянальнага банка Анатоль Мароз.

Па-першае, што ж такое ПІФ? Паявы інвестыцыйны фонд — гэта аб'яднаныя сродкі, якія грамадзяне і юрыдычныя асобы перадаюць у давяральнае ўпраўленне кіраўнічай кампаніі з мэтай атрымання прыбытку. Прасцей кажучы, гэта спосаб для прыватнай асобы атрымаць ад укладання ў каштоўныя паперы такія ж выгады, якія атрымліваюць буйныя інвестары — банкі, кампаніі, фонды. Чалавек купляе пай фонду, а далей, як кажуць, справа тэхнікі. Калі надыходзіць устаноўлены тэрмін і можна забраць свае грошы назад, вы атрымліваеце разам з укладзенымі грашамі і працэнт, які атрымаўся за гэты перыяд. І вось тут некаторыя ўкладчыкі і могуць сутыкнуцца з нечаканасцямі...

— У Расіі ПІФаў — сотні, — распавядае аб некаторых акалічнасцях інвеставання ў паявыя інвестыцыйныя фонды Анатоль Мароз. — І пры такой прапанове выбраць патрэбны ПІФ надзвычай складана нават прафесіяналам фондавага рынку, не кажучы ўжо пра тых, хто не мае спецыяльных ведаў па пытаннях абарачэння каштоўных папер і інвеставання. Улічваючы ж той факт, што аперацыі па набыцці паёў паявых інвестыцыйных фондаў РФ звязаны з высокай ступенню рызыкі, укладанне грошай з мэтай атрымання высокай даходнасці можа быць звязана з рызыкай страты гэтых сродкаў. Да таго ж, заяўленая ПІФамі вялікая даходнасць па грашовых сродках, якія размяшчаюцца, спрыяе росту інтарэсу да такога віду актываў, часам ажыятажнаму, што, як правіла, характэрна для высокарызыкоўных аперацый.

Зазначу, што кошт паёў з часам можа як павялічвацца, так і памяншацца, паколькі змяняецца рынкавы кошт каштоўных папер у складзе маёмасці фонду. Менавіта таму ўладальнікі інвестыцыйных паёў нясуць рызыку страт, звязаных са змяненнем кошту паёў. Даходнасць ПІФаў НЕ ГАРАНТУЕЦЦА НІ ДЗЯРЖАВАЙ, НІ КІРАЎНІЧАЙ КАМПАНІЯЙ. Кіраўнічая кампанія таксама не мае права прадстаўляць нейкія гарантыі, абяцанні і прапановы аб будучай эфектыўнасці і даходнасці яе інвестыцыйнай дзейнасці. Праблемным момантам з'яўляецца таксама і ацэнка статусу надзейнасці паявога інвестыцыйнага фонду, упраўляючай кампаніі.

Высокі працэнт — не гарантыя яго атрымання

Самае важнае, што неабходна ведаць аб ПІФах — гэта тое, што яны не даюць ніякіх гарантый сваім пайшчыкам. Любыя віды паявых інвестыцыйных фондаў (адкрытыя, інтэрвальныя, закрытыя) не могуць паводле заканадаўства даваць якія-небудзь гарантыі па даходнасці і нават проста па зберажэнні капіталу. Акрамя таго, заяўленая даходнасць не можа быць пастаяннай і захоўвацца на доўгатэрміновы перыяд, так як фондавы рынак напрамую залежыць ад стану эканомікі краіны. Трэба адзначыць, што дынаміка ставак на рынку таксама не можа ісці заўсёды ўверх. Такім чынам, наш грамадзянін, выступаючы інвестарам, самастойна нясе абавязкі і рызыкі, звязаныя з укладаннем інвестыцый у паявыя інвестыцыйныя фонды.

Вы гатовыя рызыкнуць?..

Ігар ШЧУЧЭНКА.

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.01.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 150,00
1 еўра	3 168,24
1 латвійскі лат	4 543,05
1 літоўскі літ	917,12
1 чэшская крона	122,53
1 польскі злоты	876,94
1 расійскі рубель	87,98
1 украінская грыўня	423,88

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,4386
10 UAH	47,9536
1000 BYR	11,3450
EUR	36,0714

Курс у гандлёвых кампаніях (на 25.01.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ISSN 1990 - 763X